Добры дзень, паважаная рэдакцыя часопіса “Народная асвета!

Вельмі падабаецца мне Ваш часопіс за разнастайнасць пададзенага ў ім матэрыялу. У Вашым часопісе можна знайсці як распрацоўкі ўрокаў па любым прадмеце, так і пазакласных мерапрыемстваў, што, на мой погляд, вельмі важна. Пазакласнай дзейнасці па прадметам кожны настаўнік адводзіць немалаважную ролю ў сваёй рабоце.

Дазвольце і мне прапанаваць не толькі Вашай увазе, але і ўвазе шырокага кола чытачоў два пазакласныя мерапрыемствы па беларускай мове і літаратуры.

Сырамалотава І.М., настаўніца беларускай мовы і літаратуры ДУА “Хонаўскі НПК ДС-СШ”, Магілёўскага раёна, Магілёўскай вобласці.
Тэлефоны: Дам. 80(222)213770, маб.(Вел.) 293281541
Пашпартныя даныя: КВ 0443012
Дата выдачы:18.02.2000
Магілёўскім РАУС

**ДУА “Хонаўскі НПК ДС-СШ”**

***Літаратурна-музыкальная кампазіцыя з элементамі інтэрактыўнай гульні***

# *Голас маці, нібы калоссе, заўсёды звініць у душы*

Голас незнаёмага можа здзівіць,
Голас друга – на хвіліну спыніць,
Голас любай – сагрэць сонцам лета,
Голас маці вярнуць з таго свету .
М.Танк.

Маці – пачатак усіх пачаткаў, апора і надзея,
Будучае народа, падтрымка ў горы і радасці.
С.Грахоўскі.

Людзі, ні на секунду не забывайце, хто даў вам жыццё, хто беражліва насіў вас пад сваім сэрцам…Матуля – Божая пасланніца на зямлі. У ёй – святы дух…
У.Ліпскі.

**<u>Мэта :</u>** Выхоўваць у навучэнцаў павагу, добрасардэчныя, чулыя адносіны да самага блізкага, дарагога і роднага чалавека – маці.

**Ход мерапрыемства**

**Настаўнік.** Сёння ў нас незвычайны дзень. Менавіта на 14 кастрычніка прыпадае вялікае хрысціянскае свята Пакровы. Закончана летняе і асенняе жніво, выбраналён, выкапана бульба, пасеяна азіміна. Нездарма ж казалі: “У кастрычніку і хата з дрывамі, і гаспадар з лапцямі”. Гэта і ёсць свята шчырай падзякі маці-зямлі.

Святкуючы Пакровы, Царква ўшаноўвае падзею, якая адбылася ў 910 годзе ва Улахернскім храме ў Канстанцінопалі. Перад калекам Андрэем і яго вучнем Епіфаніем паўстала Боская Маці і, узняўшы над імі белае покрыва, звярнулася да Бога з малітвай аб уратаванні свету і збавенні людзей ад розных няшчасцяў.

(Гучыць песня “Малітва”)

А яшчэ ў Беларусі з 1996 года 14 кастрычніка зацверджаны як Дзень маці.

**1-вядучы.** Так, як маці, на свеце ніхто не ўмее
За дзяцей хваляваецца і перажываць.
Так, як маці, ніхто не ўмее на свеце
Немаўлят сваіх песціць, калыханку спяваць.

**1-чытальнік.** Я слаўлю мамы светлае імя-
Пяштонае, нібыта яблынь квецень.
Матулінага сэрца цеплыня
Нас саграваела лепш за ўсё на свеце.
Я слаўлю мамы светлую душу,
Якая разумее нас з паўслова.
Я толькі маму памагчы прашу,
Калі жыццё паставіцца сурова.

Я слаўлю позірк маміных вачэй,
Якія бачаць, што нам невядома.
Даруйце боль праплаканых начэй,
Калі нас доўга не бывае дома.

Я слаўлю маму, бо яна – як Бог –
Усім прабачыці і ўсё даруе,
Яна для нас сабою ахвяруе,
як аніхто пакуль яшчэ не змог.

**Гульня “Намалюй букет для мамы”.**
(Гульня праводзіцца пад музыкальнае суправаджэнне “Песенка пра маму”, выконвае дзіцячы ансамбль “Барбарыкі”)

**2-чытальнік.** **Маці**
Ці завіруха за акном мяце,
Ці сонца свеціць у старэнькай хаце,
Чакае ў госці да сябе сваіх дзяцей
Сялянскай доляй стомленая маці.

Слязінка часам скоціцца з вачэй,
Ёй адзінока ў цішыні халоднай,
Бо шмат ужо мінула дзён-начэй,
Як паляцелі дзеткі з хаты роднай.

Іх падхапіў і ўдалячынь панёс
Жыцця дарослага сцюдзёны вецер.
Чакаць дзяцей – такі ўжо матчын лёс,
Ды хіба ж гэта разумеюць дзеці?

У колавароце паўсядзённых спраў
Наведваем мы рэдка, скажам прама,
Той дом, дзе ты, маленькі, моцна спаў,
Дзе берагла твой сон дзіцячы мама.

У век прагрэсу стала нам прасцей,

Забыўшы векавечныя законы,
Прыкрыцца словамі “ды тут не да гасцей”
І ўсё даверыць трубцы тэлефона.

Падніме маці трубку, і здалёк
Знаёмы ціхі голас данясецца.
Нібы на родны ступіш ты парог,
Спакой ласкавы адагрэе сэрца.

Ад думак светлых стане ясна ў галаве,
Спагада шчырая душу тваю атуліць.
Падзякуй Богу, што на свеце дзесь жыве
Твой самы блізкі чалавек – твая матуля.

**Песня “Мама мая”** ў выкананні Ул. Цвятаева.

**Гульня “Збяры прыказкі, прымаўкі”**
(На дошцы запісаны першыя часткі прымавак і прыказак. Асобна надрукавана іх прадаўжэнне. Задача вучняў знайсці прадаўжэнне прыказак і прымавак)

- Пры сонейку цёпла, пры мамцы добра.
- Маміна крыло і ў мароз цёплае.
- Матчына малітва з дня мора дастане.
- Ніхто столькі жалю не мае, як родная матка.
- Маці – самы надзейны сябар.
- Маці апошні акраец аддасць дзіцяці.
- Хоць будзеш ужо старэнькі, а для маці – усё маленькі.
- Беражы маці, не век яна маладою будзе.
- Самы вялікі грэх – пакрыўдзіць маці.
- Пакуль маці любіць – лёс дзіця галубіць.
- Дзе маці нарадзіла, там і Радзіма.
- Як дзетачкі ляцяць да сонца, глядзіць матулечка ў ваконца.
- Голас маці, нібы калоссе, заўсёды звініць у душы.

**3-чытальнік**

**Мама.**

Мая мама добрая такая,
Мая мама проста залатая!
А ўжо так мяне матулька любіць!
Кожны раз і песціць і галубіць,
І да сэрца горне, і мілуе,
І так шчыра-моцна пацалуе,
І прамовіць ласкавае слоўца,
І сама засвеціцца- як сонца!

**4- чытальнік**

Раней за ўсіх яна ўстае,
Пазней за ўсіх кладзецца.
Яна жыве, яна пяе, -
І дзецям лепш пяецца.

Ты рос, як цёплы каласок,
Пры месяцы і зорах
Пачуеш мілае “сынок”,
Хоць будзе і за сорак…

За словам “маці” у свет пайшлі
Маленства, мара, мова.
І мір, і мужнасць на зямлі-
Жыцця твайго асновы.

Каб не тужыла па начах,-
Ёй падрастай на ўцеху!
Хай будзе ў матчыных вачах
Пабольш іскрынак смеху!

Ты не шкадуй ласкавых слоў
Для роднай, для адзінай.
Адказвай маці на любоў –
Будзь верным, добрым сынам!

Эдзі Агняцвет

**5-ы чытальнік.**

Яна заўсёды на сябе ўсё брала,
Каб толькі дзецям болей адпачыць.
Палола, жала, ткала, абшывала
І пазычала дня ў начы.

За ёй ішлі мы і вясной, і ўлетку,
Дапамагалі, як маглі, не раз.
Яна ж казала: “Адпачніце, дзеткі,
Я спраўлюся з работаю без вас.

Няхай зязюлька вам гадкоў наліча,
Не гнуцца вам патрэбна , а расці.
Калі мне цяжка будзе, я паклічу…”
Ды кліч той не пачулі пры жыцці.

Прыеду, пастаю каля пагорка.
Цвіце даўно не першая вясна.
На сэрцы і балюча, і горка.
Яна і там спраўляецца адна.

Было вясною неба без аблокаў,
Блакітнае – як хочацца зірнуць!
Яна плыла ў вырай свой далёкі.
Адкуль ніякім крылам не вярнуць.
Прыеду, пастаю каля пагорка.
Цвіце даўно не першая вясна.
На сэрцы і балюча, і горка.
Яна і там спраўляецца адна.

Перад вачыма роднае аблічча,

Яна адводзіць хмары і бяду.
Яна пакліча, ведаю, пакліча,
І я пайду, як верны сын, пайду.
Ю.Свірка

**Песня** "Маміны рукі, маміна сэрца" (аўтар Дзіна Мігдал)
**Гульня "Знайдзі рэч сваёй маці"**
**Інсцэніроўка легенды "Маці"**

**Настаўнік:** А цяпер паслухайце легенду пра маці. Думаю, што для многіх яна будзе павучальнай.

**1-чытальнік.** Даўным-даўно на беразе Чорнага мора жылі людзі. Яны аралі зямлю, пасвілі скаціну і палявалі на дзікіх звяроў. Восенню, калі скончваліся палявыя работы, людзі выходзілі на бераг мора і ладзілі вясёлыя святы, спявалі, танцавалі ля вогнішча, бавілі час у гульнях, якія скончваліся кіданнем стрэлаў шчасця.

Калі юнак хацеў стаць паляўнічым, ён пускаў стралу ў бок лесу, калі пастухом – у бок стэпаў, калі ж аратым – у бок поля. Глядзець на гэтыя гульні выходзіў сам цар Нептун. Кожны раз, гледзячы на гульні, ён усміхаўся і казаў:

**Нептун.** Як людзі не выхваляюцца сваёй сілай, а мяне ўсё ж баяцца. Ніхто з іх не адважыўся пусціць стралу ў бок маіх уладанняў.

**2-і чытальнік.** Аднойчы выйшлі да вогнішча юнакі, раптам павярнуліся ў бок мора і ўсе, як адзін, пусцілі стрэлы. Нептун прыйшоў у шаленства.

**Нептун** . Я ўсіх вас пахаваю ў безданні марской!

**2-і чытальнік** Жанчыны задумаліся, марскі цар на самой справе можа пахаваць іх у моры. Думалі яны, думалі і вырашылі аддаць усю сваю сілу сынам. Юнакі, узяўшы мацярынскую сілу, падышлі да самага берага мора. Каб не пусціць іх да вады, Нептун узяў вялікія хвалі, але хлопцы не пабеглі назад. Затое пасля гэтага іх маці сталі слабымі.

**1-ы чытальнік.** Калі Нептун убачыў, што юнакі не адступілі, ён дзіка рассмяяўся і злосна закрычаў жанчынам:

**Нептун.** Няхай сабе вашыя сыны выстаялі супраць мяне тут на беразе, але ў моры я парву ім рукі.

**1-ы чытальнік**. Жанчыны зноў задумаліся. Так, і гэта марскі цар зрабіць можа, у яго моцныя жылы. Пакуль яны думалі, на паверхню выплылі дочкі Нептуна. Яны, як і іх бацька былі вельмі непрыгожыя, і таму папрасілі:

**Дочкі.** Жанчыны, аддайце нам сваю прыгажосць, а мы дастанем з дна мора моцнай травы, спляцем з яе жылы для вашых сыноў, і рукі іх будуць такія ж моцныя, як у нашага марскога бацькі.

**2-і чытальнік** Жанчыны адразу пагадзіліся і аддалі дочкам марскога цара сваю прыгажосць.

**1 –ы чытальнік:** Цар Нептун даведаўся аб гэтым, што зрабілі яго дочкі і разгневаўся, выкінуў іх з мора і ператварыў у чаек.

**Настаўнік.**Вы чулі, як чайкі плачуць над морам? Гэта яны просяцца дахаты, але жорсткі бацька не пускае іх назад і нават не глядзіць на іх. Затое маракі заўсёды глядзяць і наглядзецца не могуць на чаек, таму, што яны носяць прыгажосць іх маці.

**2-і чытальнік:** Юнакі, адчуўшы моц у руках і плячах, нарэшце выйшлі ў мора. Выйшлі і прапалі. Чакаюць іх маці, чакаюць – не вяртаюцца сыны. Паявіўся зноў перад жанчынамі Нептун і засмяяўся так, што ад яго смеху нават хвалі захадзілі на моры.

**Нептун**. Не дачакацца вам цяпер сваіх сыноў! Яны ж блукаюць. Вы забыліся, што на моры няма ні дарог, ні сцяжынак.

**Жанчыны.** Няхай будзе ў нашых вачах менш святла, але няхай над нашай зямлёй яшчэ ярчэй гарацьзоркі, каб нашы сыны знайшлі па іх дарогу да родных берагоў.

**1-ы чытальнік.** Толькі яны так сказалі, і ў небе адразу ярка-ярка заблішчэлі зоркі. Юнакі ўбачылі іх і хутка вярнуліся дадому. Вось чаму маракі моцныя і непераможныя. Маці аддалі ім усё лепшае, што мелі.

**Настаўнік.** Вы бачылі калі-небудзь слабых жанчын? Калі сустракаеце, ведайце: гэтыя жанчыны аддалі сваю сілу дзецям.

Калі вы ўбачыце дзе-небудзь непрыгожую жанчыну, ведайце: гэта яна ахвяравала сваім хараством дзеля дзяцей.

**6-ы чытальнік.** **Ніл Гілевіч “Маці”**

Я ўзыходжу на двор,
Я кажу ёй “Са святам!”
І цалую знаёмыя родныя вусны,
І бяру пад руку,
І іду з ёй у хату,
Дзе ад прыпечка б’е
Дух гарачы капусны.

Я гляджу ў яе вочы,
Што свецяцца шчасцем,
Гладжу рукі сухія,
Прапахлыя зеллем
І схілюся да сэрца…
А трэба б упасці
Перад ёю-нядужай, сівой –
На калені.

Вочы маці!
У доўгія зімнія ночы
Вы над намі
Вясёлымі зоркамі ззялі,
Вы ў нясцерпнай дрымоце
Зліпаліся, вочы,
Але, усё ж усміхаліся нам,
Забаўлялі…

Рукі маці!
Вы ў працы не знялі прынукі,
Вы насілі штогод
Мазалі, як бабіны,
Вы аж нылі ўвечар.
Матуліны рукі,
Спавіваючы нас
Перад сном галубіным.

Сэрца маці!
Наш боль быў тваім,
Не іначай,
Сорам наш
Ты насіла велізарным горам,
Кропля ж кожная
Радасці светлай дзіцячай

Напаўняла цябе,
Разлівалася морам…
А цяпер ёй –
Адно б на сынка наглядзецца…
Жаль і горыч, і боль
Мне душу працінае!
Як жа позна,
Як позна, любімыя дзеці –
Мы няўдзячнасць сваю
Разумець пачынаем…

**Настаўнік.** Ёсць матчына любоў.
Яе не зблытай
З ніякай, бо няма нідзе такой -
Пяшчотнай, бескарыслівай, адкрытай.
Шчаслівы ты, пакуль яна з табой.

**РЭФЛЕКСІЯ .** Прадоўжыце сказ:

**ШАНУЙ ………………**
**ЛЮБІ …………………**
**БЕРАЖЫ ……………….**
**ГАНАРЫСЯ ……………**
**ПАМЯТАЙ ……………..**